Воінава А.М., Хазанава К.Л. (Гомель)

Абрадавыя традыцыі ўсходніх славян у творчай спадчыне Максіма Багдановіча

Адным з актуальных і перспектыўных напрамкаў сучасных навуковых даследаванняў з'яўляецца вывучэнне духоўнай спадчыны народа. Этналінгвістычны падыход, які аб'ядноўвае этнаграфію, фальклор і мовазнаўства, дазваляе разглядаць мову ў цэлым, а таксама мову кожнага пісьменніка праз прызму традыцыйнай народнай духоўнай культуры. У аснову згаданага падыходу пакладзена формула «мова + культура», якая па-рознаму праяўляецца ў творах канкрэтнага аўтара. Надзвычай цікавым аб'ектам даследавання з'яўляецца творчасць выдатнага паэта і публіцыста М. Багдановіча, у творчасці якога знайшла адлюстраванне багатая духоўная культура ўсходнеславянскіх народаў.

У кантэксце ўзаемазвязанага вывучэння мовы і культуры беларускага народа аб'ектам увагі становяцца культурна афарбаваныя моўныя адзінкі – лексемы, якія з'яўляюцца прадуктам кумулятыўнай функцыі мовы. У такіх адзінках дастаткова дакладна адлюстраваны дыялектныя рысы і многія асаблівасці беларускай гаворкі. У некаторых словах этнаграфічная інфармацыя для сучаснага носьбіта мовы з'яўляецца імпліцытнай, прыхаванай і можа быць атрымана толькі апасродкавана, але яна ёсць і працуе на ўзроўні падсвядомасці.

Дзяцінства М. Багдановіча прайшло ў прасторы багатай культурнай спадчыны ўсходніх славян. Плённая даследчая дзейнасць бацькі – этнографа і фалькларыста А.Я. Багдановіча – спрыяла фарміраванню будучага паэта.

Вершы яго прасякнуты элементамі старажытнай духоўнай культуры ўсходніх славян. Так, лірычны герой шчыра вітаецца з зарой: «*Добрай ночы, зара-зараніца!*» («Добрай ночы, зара-зараніца»). У згаданым вершы паэта, як і ў фальклорных творах, узнікаецца адметны эпітэт, выражаны прыдаткам і заснаваны на асацыятыўным спалучэнні аднакарэнных лексем. Спалучэнне падобных пар назоўнікаў надзвычай характэрнае для беларускай паэтыкі. Значэнне суфікса ('асоба жаночага полу') фармалізавала персаніфікацыю. Шматразовыя паўторы зычных [з], а таксама кальцавая структура верша стварылі перакрыкаванні пачуццёвых асацыяцый, своеасаблівае гукавое святло і незвычайную музычнасць: «Добрай ночы, зара-зараніца! / Ўжо імгла над зямлёю лажыцца, / Чорнай рызай усё пакрывае, / Пылам зор небасхіл абсявае. / Цішыня агартае мне душу! / Вецярок прыдарожную грушу / Ледзьве чутна варуша-калыша, / Міла бомы смяюцца у цішы, / Ціха срэбрам грукае крыніца. / Добрай ночы, зара-зараніца!» [1, с. 63].

Фальклорныя матывы вяснянак – славянскага гукання вясны пасля зімовага холаду – М. Багдановіч творча выкарыстаў у лірычным аповедзе прыходу вясны: «Прыйдзе вясна! / Гукне: "Прачніся, зямля! прабудзіся / З цяжкага сна!" / Сонца прагляне, зазелянее / Траўка ў лугу, / Гукне вясна і, як ветрам, развее / Гора-нуду!» [1, с. 197]. Тут ужо не чалавек кліча («*гукае*») вясну, а зямля і вясна пераклікаюцца. Такім чынам, паэтава думка аб'яднала два старажытныя славянскія элементы: адухаўленне зямлі і кліканне вясны.

У старажытнасці людзі не маглі растлумачыць і абгрунтаваць многія прыродныя з'явы. Адсюль – надзяленне чалавечымі якасцямі прыродных рэалій.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Існаванне М. Багдановіча ў духоўнай прасторы старажытнай усходнеславянскай культуры спрыяла ператварэнню ў яго вершах некаторых з'яў прыроды ў жывыя істоты: «За сцяной запявае завея» («Ноч»). Адметна, што перш за ўсё гэта адносіцца да зімовых выяў: «Разгулялася вясёлая мяцель, / Прабудзіўся, ў поле кінуўся Падвей. / Ў галаву яму ударыў снежны хмель, – / І не змог ён бурнай радасці сваей» [1, с. 217] («Падвей»).

Паводле беларускай міфалогіі *Падвей* – гэта злы дух, які круціцца ў віхры, прыносіць разбурэнні і хваробы [3, с. 110]. Бацька паэта, А.Я. Багдановіч, у даследаванні «Пережитки древнего миросозерцания у белорусов» занатаваў павер'е аб Падвеі. Праз творчае ўспрыманне М. Багдановіча Падвей атрымаўся адметны: «І спеў ліецца ўсё мацней, – / Гулянку справіў пан Падвей. / <...> Па вулках вее дзікі хмель, / Гудзіць сп'янелая мяцель. / У бубны дахаў вецер б'е, / Грыміць па ім, звініць, пяе» [1, с. 100].

У паэтычных і празаічных творах паэта можна знайсці элементы сямейнай абраднасці, да якой традыцыйна адносяць вясельны, радзінна-хрэсьбінны і пахавальны абрады. Неабходна прыгадаць, што ўслед за бацькам М. Багдановіч праводзіў этнаграфічныя даследаванні (цыкл публіцыстычных артыкулаў «Образы Галиции в художественной литературе») У артыкуле «Равнина» ён прыводзіць апісанне ўкраінскага вяселля, узятага з аповесці І. Франко «Вялікі шум»: «А в субботу после полудня зароилося Думячихино подворье от девушек, парней и свашек в праздничном убранстве. Начался свадебный обряд плетеньем венков и печеньем каравая» [2, с. 113].

У творчай спадчыне М. Багдановіча згадваецца сямейна-абрадавае свята *радзін*. Прыкмета індывідуальнага падыходу М. Багдановіча пры гэтым – сум і смутак, з якімі паэт апісвае нараджэнне дзіцяці: «Пасля радзін ты ўсё штодня марнееш: / Асунулася цені, зблякла твар» [1, с. 163]. Сумныя матывы ўзмацняюцца ў аповедзе пра *паўтуры*: «Чорны крэп, спеў царкоўны, пах ладана, / Труп, ляжачы ў труне нерухома» [1, с. 241].

Паэзія М. Багдановіча сведчыць аб добрым веданні творцам каляндарна-абрадавых традыцый усходніх славян. Ён узгадвае *Масленіцу* – усходнеславянскае свята развітання з зімой. Традыцыйнай ежай на Масленіцу станавіліся бліны з ікрой як сімвал сонца, багацця і жыцця. Чытаем аб Масленіцы ў вершы-байцы «Икра»: «На маслянице слышал я от друга: «Не говорите никогда мне про икру» [1, с. 336].

Ва ўжо згаданым публіцыстычным артыкуле «Образы Галиции в художественной литературе» М. Багдановіч звярнуў увагу на вядомае ўсходнеславянскае свята *Мялання*: «На Меланью (31 дек.) к скотине в ее хлевы приходил Бог» [2, с. 118]. Паводле ўкраінскай каляндарна-абрадавай традыцыі 13 снежня (у адпаведнасці са старым стылем – 31 снежня) адзначалася *Мялання (Маланка, Мяланка)* [4, с. 107].

Маланка, Мяланка, Міланка, лічаць даследчыкі, у фальклоры абазначае некалькі паняццяў: святочная дата ў календары, абрадавы хлеб, гераіня навагодніх песень, антрапаморфная маска-персанаж, група масак-удзельнікаў абраду, традыцыйны навагодні абрад, архаічны тып калядных абходаў. Свята ўстаноўлена ў гонар знатнай рымлянкі Мяланіі (Маланкі), якая з юных гадоў і да смерці шанавала Хрыста. Адзначалася яно і ў беларусаў. Традыцыйна

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Маланка згадваецца разам з імем *Васіля*: «А яшчэ ў Васіля павінна быць дзяўчына, яе называлі Маланка. Маланку мы ўпрыгожвалі, дзелалі карону, фартух з абруса, а таксама адзявалі ружовыя рукавіцы. Васіль з Маланкай ішлі ў хату і прасіліся пашчадраваць, каб Маланка песні паспявала» [5, с. 176].

Лексічнае багацце мовы вершаў М. Багдановіча ўказвае на глыбокае веданне ім духоўных скарбаў культуры ўсходніх славян. Так, паэт узгадвае розныя спосабы варажбы: варажба ў калядную ноч: «Ты ночкаю каляднай варажыла / І ў воду воск напоўправідны ліла» [1, с. 220]; варажба паводле кукавання зязюлі: «Не кувай ты, шэрая зязюля, / Сумным гукам у бары; / Мо і скажаш, што я жыці буду, / Але лепш не гавары» [1, с. 82].

Хрысціянства прынесла новую мадэль Сусвету. Цяпер славяне з усімі няшчасцямі, бедамі, скаргамі звярталіся да Бога як да найвышэйшага суддзі. Натуральна, што хрысціянскія матывы і вобразы таксама адлюстраваліся ў творах М. Багдановіча: «Асвячае мне вобраз Хрыста... яго крыж... / Ажываеш, здаецца, душою гарыш. / Але толькі чаму ж так малы гэты час?! / Зноў навокал цемнь. Свет зірнуў і пагас. / Не глядзіць на мяне ясны вобраз Хрыста» [1, с. 214]; «Што ж, пастаў прад абразамі, запаліўшы, свечку» [1, с. 83].

На працягу ўсяго існавання людзі шукалі прычыны адсутнасці гармоніі ў чалавечым жыцці. У свядомасці сфарміраваўся інварыянтны міфалагічны канцэпт *лёсу і долі*, у якім славянскі менталітэт вылучыў спецыфічныя рысы, што праявіліся ў мове. Ствараючы вобраз *долі*, народная фантазія абагуліла жыццёвыя назіранні ў формулах, якія ўвасобілі ідэал жыццёвай з'явы. Для нашых продкаў *доля* здавалася нябачнай субстанцыяй, што змяняе формы. У вершах М. Багдановіча выявіўся адметны культурна-лінгвістычны партрэт канцэпта *лёс – доля. Доля* – асноўнае паняцце міфалагічнай карціны свету – служыць персаніфікацыяй поспеху: «Так свабодна, так ярка пражыць – / Лепшай долі няма на зямлі» [1, с. 104].

Паэзія проза і публіцыстыка М. Багдановіча паказвае, што пісьменнік творча перапрацоўваў духоўную спадчыну ўсходніх славян. У выніку міфалагічныя і рэлігійныя матывы арганічна спалучыліся і, хутчэй за ўсё на падсвядомым узроўні, увайшлі ў мастацкія творы.

Літаратура

1. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск, 1992–1995. – Т. 1 : Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. – 1992.
2. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск, 1992–1995. – Т. 3 : Публіцыстыка, лісты, летапіс жыцця і творчасці. –1995.
3. Коваль, У.І. Народныя ўяўленні, павер'і і прыкметы : даведнік па ўсходнеславянскай міфалогіі / У.І. Коваль. – Гомель, 1995.
4. Курочкін, О. Українці в сім'ї європейскій: звичаї, обряди, святи / О. Курочкін. – Київ, 2004.
5. Народная духоўная культура Брагіншчыны : фальклорна-этнаграфічны зборнік ; склад. В.С. Новак, У.І. Коваль. – Гомель, 2007.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ